НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

Дадатак да бюлетэня “Новыя кнігі:
па старонках беларускага друку”,
2011, № 4

# НЯБЕСНАЯ ЗАСТУПНІЦА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ



## Да 910-годдзя з дня нараджэння Ефрасінні (Еўфрасінні) Полацкай

Бібліяграфічны спіс

Мінск

Многія мысліцелі і асветнікі, якія нарадзіліся ў Беларусі, на працягу XII–XX стст. узбагацілі сваімі ведамі, думкамі, талентам скарбонку айчыннай і сусветнай навукі, культуры. Асімілюючы дасягненні еўрапейскай цывілізацыі, грамадска-палітычныя і рэлігійныя дзеячы, філосафы і педагогі, вучоныя і пісьменнікі, кнігадрукары і краязнаўцы неслі веды суайчыннікам, далучаючы іх да набыткаў агульначалавечай культуры. Яны разумелі і памяталі: веды – гэта тое святло, што, запаленае аднойчы, здольна нязгаснай лампадай свяціць скрозь вякі. Несла святло ведаў і славутая Ефрасіння Полацкая – князёўна, манахіня, ігумення, паломніца, кананізаваная святая, кніжніца, асветніца, мецэнатка. З яе імем звязана адкрыццё першых адукацыйных устаноў і бібліятэк, стварэнне школы архітэктуры і жывапісу, развіццё рамёстваў. Падзвіжніцтва, асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай мелі вялікае значэнне для грамадскага і дзяржаўнага жыцця Полацкага княства. Справу славутай палачанкі падхапілі, паглыбілі і развілі Францыск Скарына і Васіль Цяпінскі, Сымон Будны і Спірыдон Собаль, Сімяон Полацкі і браты Зізаніі.

З цягам часу ўсё больш выразна ўсведамляецца веліч здзяйсненняў Ефрасінні Полацкай. Пра яе жыццё амаль не захавалася дакументальных звестак. Асноўнай крыніцай з'яўляецца "Жыціе Ефрасінні Полацкай…". Яго вывучэнне мае вялікае значэнне для выхавання маладога пакалення: фарміравання духоўнасці, дабрачыннасці, маральна-этычных поглядаў, любві да Радзімы, патрыятызму. Жыццёвы шлях і разнастайная дзейнасць Ефрасінні Полацкай адлюстраваны ў прапанаваным спісе. Прадстаўленая інфармацыя будзе карысна ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускага асветніцтва. У дадатку змешчаны дакументы, выдадзеныя за апошнія дзесяць гадоў.

Матэрыялы пра Ефрасінню Полацкую можна знайсці на сайтах: www.belarus.by, www.church.by, www.polotskgik.by.

## Як прамень сонечны

### Жыццё і дзейнасць Ефрасінні Полацкай

Час спрасоўвае стагоддзі, зближае падзеі, зносіць нязначнае ў мінулым і захоўвае вечнае, што паўстае з летапісаў, старажытных кніг, гістарычных дакументаў. Дзякуючы гэтым крыніцам з глыбіні вякоў даходзяць да нас звесткі пра людзей, якія праславілі беларускую зямлю. Сярод іх вылучаецца асоба Ефрасінні Полацкай – вечна жывой святой, мудрай асветніцы, дарадчыцы і выратавальніцы ў хвіліны тугі і адчаю. Яна не толькі годна жыла, але і паказвала прыклад іншым, як трэба жыць, як неабходна самаахвярна і самааддана служыць Бацькаўшчыне.

Радзіма асветніцы – Полацкае княства – магутная раннефеадальная дзяржава, дзе кіравала дынастыя Рагвалодавічаў. Ефрасіння паходзіла з гэтага роду. Яе продкамі ў чацвёртым калене былі хрысціцель Русі вялікі князь кіеўскі Уладзімір Святаславіч і гордая княгіня Рагнеда – дачка Рагвалода, а дзедам – легендарны полацкі (а некаторы час і кіеўскі) князь Усяслаў Брачыславіч (у народзе яго празвалі Чарадзей). Разважлівы і прадбачлівы палітык, ён умацаваў суверэнітэт княства, пашырыў яго

межы, нават стаў адным з герояў бессмяротнага “Слова аб паходзе Ігаравым” – прыгадваецца ў той частцы твора, дзе аўтар распавядае пра бітву на Нямізе. У час праўлення князя быў пабудаваны славуты Сафійскі сабор, што і сёння з’яўляецца візітнай карткай Полацка. Нямала нашчадкаў Усяслава – выдатных воінаў, палітыкаў, шчырых патрыётаў – увайшло ў гісторыю Беларусі, аднак найбольшую славу Полацку і ўсёй краіне прынесла ўнучка Чарадзея Прадслава, якой было лёсам наканавана далучыць да свайго імя назву роднага горада і назаўсёды застацца ў яго гісторыі. Менавіта яна стала гераіняй “Жыція Ефрасінні Полацкай…”, што дайшло да нашых дзён у рукапісах XIV–XVIII стст.

Князёўна Прадслава (свецкае імя Ефрасінні) нарадзілася ў сям’і полацкага князя Святаслава-Георгія і княгіні Сафіі, дачкі Уладзіміра Манамаха. Дакладная дата яе нараджэння невядома. Супастаўляючы розныя даныя, адны вучоныя лічаць гэтай датай 1101 г., другія сцвярджаюць, што дзяўчынка з’явілася на свет паміж 1104–1116 гг. Бацькі князёўны былі па тым часе вельмі адукаванымі людзьмі. Святаслаў-Георгій меў пры княжацкім двары багатую бібліятэку, для якой збіраў творы, распаўсюджаныя ў Візантыі і ў княствах Русі: набажэнскую, духоўную літаратуру, жыціі святых, кнігі па антычнай гісторыі і схаластычным апісанні прыроды. Маці Прадславы, сястра візантыйскага імператара Мануіла І Комніна, знаёміла дзяўчынку з гісторыяй і культурай старажытнай Грэцыі. З маленства князёўна чула ад бацькоў паданні пра славутых продкаў, а яе блізкімі сваякамі былі князі кіеўскія, тураўскія, пераяслаўскія, смаленскія, растова-суздальскія, уладзіміра-валынскія, імператары Візантыі і каралі Венгрыі. Прадслава рана пазнаёмілася з тагачасным палітычным жыццём Полаччыны, з няўстойлівасцю княжацкай улады і міжусобнай барацьбой князёў. Грамадскія і палітычныя падзеі, што адбываліся ў княстве, уплывалі на светапогляд дзяўчынкі, фарміравалі яе характар. Разам з тым традыцыі роду абуджалі ў князёўны не толькі цікавасць да мінуўшчыны Полацкай зямлі, але і патрыятычныя пачуцці, і княжацкую годнасць.

Вучылася Прадслава ў школе пры Сафійскім саборы. Яе настаўнікамі былі манахі, а ў якасці падручнікаў выкарыстоўваліся Біблія, Псалтыр, Часаслоў, жыційная літаратура. Любімымі гераінямі дзяўчынкі з’яўляліся святыя пакутніцы Фяўронія і Еўпраксія. Прадслава хутка навучылася чытаць і акрамя царкоўных кніг вывучала Ізборнікі Святаслава 1073 і 1076 гг., “Александрыю” – кнігу пра подзвігі Аляксандра Македонскага, вострасюжэтную “Аповесць пра Акіра Прамудрага”. З кожным годам кнігі, над якімі заседжвалася дзяўчынка, здаваліся ёй усё больш глыбокімі і мудрымі. Дзяцінства князёўны праходзіла не толькі ў бацькоўскім доме. Яна часта бывала на кірмашах, дзе слухала гусляроў, глядзела выступленні скамарохаў, заходзіла да гандляроў і рамеснікаў. Нянькі і мамка-карміцелька пазнаёмілі Прадславу з народнымі казкамі, замовамі, заклёнамі, пелі ёй абрадавыя песні: на Полаччыне доўгі час існавалі побач хрысціянства і язычніцтва. Часта бачылі князёўну і ў Сафійскім саборы, дзе яна дапамагала сваёй цётцы-ігуменні лячыць параненых. Чуткі пра прыгожую і адукаваную дзяўчыну, што ў тыя часы было вялікай рэдкасцю, разышліся за межы Полацкай зямлі. Калі Прадславе споўнілася дванаццаць гадоў (узрост, з якога ў той час дазвалялася ўступаць у шлюб), да яе зачасцілі сваты. Аднак князёўна адмовілася ад дынастычнага шлюбу і насуперак волі бацькоў тайна пастрыглася ў манахіні, каб прысвяціць жыццё служэнню Богу і свайму народу.

Адбылося гэта 25 верасня ў дзень святой Ефрасінні Александрыйскай. Пры пастрыжэнні Прадслава, як сказана ў "Жыціі Ефрасінні Полацкай…", атрымала імя Ефрасіння.

Спачатку юная манашка жыла ў манастыры пры адной з парафіяльных цэркваў, дзе шмат малілася, спасцігаючы духоўнасць. Пазней, калі перасялілася ў маленькую келлю пры Полацкім Сафійскім саборы, праводзіла час не толькі ў малітвах і набажэнствах, але і займалася самаадукацыяй. Значную ролю ў пашырэнні яе ведаў адыгралі кнігі. У манастыры Ефрасіння больш паглыблена пазнаёмілася з хрысціянскім вучэннем. Яе ўвагу прыцягвала літаратура, у якой адлюстроўваліся погляды багасловаў на сутнасць чалавечага жыцця, адносіны паміж людзьмі, прычыны барацьбы сіл дабра і зла. Большасць кніг, прачытаных Ефрасінняй, былі рэлігійнымі. Сярод іх – творы візантыйскіх святароў і прапаведнікаў Іаана Златавуста, Грыгорыя Багаслова, Васілія Вялікага; Біблія, перакладзеная ў IX ст. на славянскую мову Кірылам і Мяфодзіем; Шасцідзёны, якія дазволілі Ефрасінні ўявіць, як Бог стварыў свет. Чытаючы кнігі, будучая асветніца не магла абысці ўвагай і навуковыя працы Сакрата, Платона, Арыстоцеля і іншых мысліцеляў і філосафаў старажытнай Грэцыі. З гісторыяй славян Ефрасінню пазнаёміла "Аповесць мінулых гадоў", а пра сусветную гісторыю яна даведалася з хронік, прывезеных з Візантыі яе родзічамі. Шляхам самаадукацыі манашка-князёўна набыла вялікую і грунтоўную эрудыцыю ў галіне рэлігійна-маральнай, філасофскай, свецкай літаратуры і ўзялася за цяжкае рамяство таго часу, якое патрабавала сталай навуковай падрыхтоўкі, цярпення, мастацкіх навыкаў, – рамяство перапісчыка.

Працэс пісьма на той час быў надзвычай складаны, працаёмкі і патрабаваў не толькі навыкаў мастацтва, але і нямалай фізічнай сілы. Перапісчыкамі былі ў асноўным мужчыны. Тое, што маладая манашка ўзялася за такую цяжкую справу, ужо само па сабе з'яўлялася подзвігам. Праца па перапісванні кніг займала шмат часу. На той час паняцці "пісьменнік" і "перапісчык" не адрозніваліся адно ад другога, бо існавала агульная назва "списатель", які мог дапоўніць твор, завяршыць яго. Гэта не адносілася да Бібліі і кананічных рэлігійных твораў. У храмавым скрыпторыі Ефрасіння перапісала шмат кніг: адны з іх ляглі ў аснову манастырскіх бібліятэк Полацкага княства, што пачыналі тады толькі фарміравацца, другія прадаваліся, а выручаныя грошы манахіня шчодра раздавала ўбогім і жабракам. Таксама яна вяла Полацкі летапіс і збірала бібліятэку Сафійскага сабора. Займалася і ўласнай творчасцю: стварала малітвы, казанні; выступала з прамовамі, якія вызначаліся красамоўнасцю і мастацкай вобразнасцю. Сваёй працай Ефрасіння Полацкая садзейнічала пашырэнню асветы ў Беларусі, але ёй было наканавана лёсам яшчэ не адно высокае служэнне Бацькаўшчыне.

Прыкладна ў 1124 г. Ефрасіння атрымала ад епіскапа Іліі вёску Сяльцо пад Полацкам, дзе на высокім беразе ракі Палаты стаяла драўляная царква Святога Спаса, пры якой знаходзілася пахавальня полацкіх епіскапаў. У Сяльцы асветніца заснавала на свае ўласныя сродкі жаночы і мужчынскі манастыры. Пра Багародзіцкі мужчынскі манастыр амаль нічога невядома. Верагодна, пры ім была пабудавана царква Святой Багародзіцы, для якой Ефрасіння Полацкая набыла ў Канстанцінопалі абраз Адзігітрыі Эфескай, напісаны паводле падання першым іканапісцам апосталам Лукой. Гэты твор прыслаў блізкі сваяк полацкіх князёў візантыйскі імператар Мануіл I Комнін у 1158 г., а благаславіў яго Канстанцінопальскі патрыярх Лука. Цяпер абраз знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу ў фондах Рускага музея. Ефрасіння

Полацкая была і фундатарам пабудовы каля 1160 г. саборнага храма пры жаночым манастыры (зараз Спаса-Праабражэнская царква), для якой ювелірны майстар Лазар Богша зрабіў знакаміты Крыж (адноўлены ў 1997 г. брэсцкім мастаком М. Кузьмічом). Галоўная царква багата ўпрыгожана фрэскамі, тут размяшчалася келля Ефрасінні, тут князёўна-манашка стала ігуменняй.

Заснаваныя Ефрасінняй манастыры зрабіліся асяродкам асветы ў Полацкім княстве. Пры іх працавалі бібліятэкі, ювелірныя іканапісныя майстэрні, скрыпторыі. У апошніх нават існавала спецыялізацыя: адны майстры выраблялі каляровыя ініцыялы і рубрыкі, другія – мініяцюрныя малюнкі-застаўкі, трэція – пераплёты. Са скрыпторыяў кнігі разыходзіліся не толькі па ўсёй Полацкай зямлі, але і за яе межы. Іх чыталі вучоныя манахі, прадстаўнікі феадальнай знаці, па іх вучыліся грамаце дзеці. Там, у полацкіх скрыпторыях, была складзена царкоўная служба, прысвечаная Ефрасінні, намаляваны яе абраз, напісаны славуты старажытны твор “Жыціе Ефрасінні Полацкай…”. Педагагічная дзейнасць асветніцы таксама заслугоўвае асобнай увагі. У створаных пры манастырах школах выкладалі чытанне, пісьмо, грэчаскую і лацінскую мовы, нотную грамату, царкоўныя спевы. Аднак ігумення імкнулася пашырыць межы звычайнай праграмы. Юныя палачане атрымлівалі звесткі па прыродазнаўстве, рыторыцы, медыцыне. Вялікая ўвага надавалася гісторыі. Яны павінны былі ведаць радавод дынастыі Рагвалодавічаў, значныя падзеі з мінулага Полацкай зямлі і ўсходняга славянства. Вучыцца маглі нават дзеці простых грамадзян. У манастырскай школе набывалі веды і сёстры Ефрасінні: родная Гардзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звеніслава (у манастве Еўпраксія). Адносіны паміж імі былі надзвычай блізкія з самага дзяцінства. Сёстры заставаліся разам і ўсё далейшае жыццё. Шляхам Ефрасінні Полацкай пайшлі таксама яе пляменніцы Кірыяна і Вольга (у манастве Агаф’я і Яўфімія) і Ефрасіння Рагвалодаўна (святая Еўпраксія Пскоўская). Менавіта прадстаўніцы полацкага княжацкага дому і склалі першы ў гісторыі беларускі гурток жанчын-асветніц, месцазнаходжаннем якога стаў Полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр.

Амаль паўстагоддзя Ефрасіння Полацкая была ўдзельніцай вялікіх гістарычных падзей, што адбываліся на Полаччыне. У XII ст. ішоў інтэнсіўны працэс феадальнага распаду, утвараліся новыя княствы, уладары якіх вялі жорсткую барацьбу за ўладу. Не былі выключэннем і князі полацкія. Ефрасіння не стаяла ў баку ад братазабойчых сварак, а спрабавала ўсіх памірыць. Ігумення не была абыякавай да таго, хто будзе княжыць у Полацку, хто стане епіскапам, бо лічыла, што свецкае жыццё неадрыўна ад манастырскага.

У красавіку 1167 г. Ефрасіння Полацкая, перадаўшы ігуменства малодшай сястры Еўдакіі, прыняла рашэнне ажыццявіць сваю даўнюю задуму – здзейсніць паломніцтва ў Святую Зямлю, наведаць Іерусалім. У час падарожжа (пешшу, а не традыцыйным шляхам “з вараг у грэкі”) асветніцу суправаджалі стрыечная сястра Еўпраксія і брат Давід. У канцы красавіка 1167 г. Ефрасіння і яе спадарожнікі прыйшлі да іерусалімскіх святынь. Тры дні запар яна наведвалася да Труны Гасподняй. У апошні дзень звярнулася да Бога з малітвай, у якой прасіла дазволу памерці ў святым горадзе. У хуткім часе ігумення занядужала і на дваццаць чацвёрты дзень хваробы памерла. Яна была пахавана ў манастыры Святога Феадосія.

Неўзабаве пасля смерці полацкай ігуменні Святой Зямлі пачалі пагражаць магаметане. У 1187 г., рыхтуючыся да прыступу Іерусаліма, султан Саладзін за выкуп дазволіў хрысціянам пакінуць горад разам са сваімі рэліквіямі. Як велізарны

скарб манахі везлі раку з нятленнымі мошчамі Ефрасінні. Яны хацелі адразу змясціць яе ў Полацку, але перашкодзіла пастаянная варожасць, што не сціхала паміж кіеўскімі і полацкімі князямі. Раку прывезлі ў Кіеў, і мошчы паклалі ў далёкіх пячорах Кіева-Пячэрскага манастыра, у падземным храме Найсвяцейшай Багародзіцы, дзе яны захоўваліся больш за сем стагоддзяў. І толькі ў красавіку 1910 г. Кіеў развітаўся з полацкай ігуменняй: рака з яе мошчамі была перавезена ў суправаджэнні флатыліі рачных судоў па Дняпры да Оршы, а потым яе неслі на руках да Полацка. 23 мая, у дзень памяці Ефрасінні Полацкай, астанкі святой даставілі ў заснаваны ёю жаночы манастыр. У час Першай сусветнай вайны (1915) мошчы эвакуіравалі ў Растоў Вялікі, дзе яны знаходзіліся ў Богаяўленскім Аўрааміевым манастыры да 1921 г. Праз год рака разам з іншымі манастырскімі каштоўнасцямі была рэквізавана. У маі 1922 г. труну святой Ефрасінні ўскрылі і адправілі спачатку ў Маскву на атэістычную выстаўку, а потым – у Віцебскі губернскі краязнаўчы музей для экспазіцыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны праваслаўныя вернікі перанеслі мошчы Ефрасінні з музея ў віцебскую Свята-Пакроўскую царкву, і толькі 23 кастрычніка 1943 г. яны былі вернуты ў полацкі Свята-Праабражэнскі храм, дзе захоўваюцца і сёння.

У канцы XII ст. пры епіскапе Дыянісіі палачане без кананізацыі прызналі сваю асветніцу святой і пачалі малітвамі шанаваць яе. Паколькі Полацк да сярэдзіны XVI ст. з'яўляўся галоўным духоўным асяродкам на беларускіх землях, культ прападобнай ігуменні пашырыўся па ўсёй Беларусі. Паступова святая Ефрасіння зрабілася ў свядомасці вернікаў нябеснай заступніцай не толькі Полаччыны, але і ўсёй краіны. У Маскоўскім княстве пра яе даведаліся ў XVI ст., калі мітрапаліт Макарый уключыў "Жыціе Ефрасінні Полацкай…" у Вялікія мінеі-чэцці. Да гэтага часу адносяцца і царкоўныя спевы пра полацкую ігуменню (адна сціхіра, вядомая ў рукапісе канца XII ст., з'яўляецца ўнікальным помнікам музычнай культуры ранняга Сярэдневякоўя ў Беларусі). Унучка Усяслава Чарадзея была першай асветніцай беларускай зямлі, яна стала і першай усходнеславянскай святой, якую кананізавалі нават раней, чым кіеўскую княгіню Вольгу. Адбылося гэта ў 1547 г. У канцы XX ст. Ефрасіння Полацкая была вернута ў гістарычную памяць беларускага народа і прызнана святой апякункай Беларусі, а ў 1984 г. далучана да Сабора Беларускіх Святых за дзейнасць на ніве ўмацавання хрысціянскай веры і асветы. Сёння святасць полацкай ігуменні прызнана не толькі праваслаўнай царквой, але і каталіцкай. Нездарма ў зацверджанай Папам Рымскім "Малітве за беларускі народ" ёсць наступныя словы: "Цябе, Прачыстая Багародзіца і наша нябесная Маці, просім: прычыніся за намі, а ты, святая Еўфрасіння Полацкая – патронка Беларусі, ды ўсе святыя заступнікі Беларускага Народу, апякуйце намі, каб мы сталі народам святым, што выконвае волю Божую і сваё пасланства…"*.

Прайшло больш за восем стагоддзяў пасля смерці Ефрасінні Полацкай, але і ў нашы дні вобраз асветніцы з'яўляецца сімвалам духоўнай сілы нацыі. Самаадданае служэнне Богу і Бацькаўшчыне ўзвысіла славутую палачанку над яе часам і зрабіла імя Ефрасінні бессмяротным. Гэта ў гонар святой, як доўгая памяць аб ёй, гучаць званы не толькі ў Полацку, але і ў далёкім канадскім Таронта, першым права-

* *Марціновіч, А. А.* Святая Еўфрасіння, альбо Адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля / Алесь Марціновіч. Мінск, 2009. С. 104.

слаўным храмам якога стала царква імя Ефрасінні Полацкай; у гарадах Саўт-Рывер (штат Нью-Джэрсі, ЗША), Лондане (Англія), Вільнюсе (Літва), Корсава (Латвія). Звоняць званы і ў Мінску ў хрысцільнай царкве імя Ефрасінні Полацкай прыхода іконы Божай Маці "Усіх тужлівых Радасць". Сёння гэта царква займаецца місіянерскай і асветніцкай дзейнасцю. Тут працуюць нядзельная школа і школа званароў, Мінскае духоўнае вучылішча, друкарня Беларускага экзархата. Сястрынства, створанае пры храме, абрала Ефрасінню Полацкую сваёй нябеснай апякункай, і, як калісьці, прападобная ігумення дапамагае хворым, бедным і абяздоленым.

Ужо не адно дзесяцігоддзе вобраз асветніцы прыцягвае ўвагу іканапісцаў, мастакоў, кампазітараў, літаратараў. Полацкую ігуменню можна ўбачыць на роспісах царквы Благавешчання ў Кіева-Пячэрскай лаўры, на фрэсках Віктара Васняцова ва Уладзіміраўскім саборы ў Кіеве. Ёсць абразы беларускай святой у Рыжскім жаночым манастыры, у Кафедральным Успенскім саборы ў Вільнюсе, вялікі вынасны абраз захоўваецца ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры ў Полацку. Многія мастакі прысвяцілі свае творы Ефрасінні Полацкай. Сярод іх вылучаюцца палотны Н. Шчаснай, графічныя аркушы А. Кашкурэвіча. У тэхніцы габелена партрэт Ефрасінні Полацкай стварыў С. Свістуновіч. У 1997 г. у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адбылася выстаўка "Шлях Еўфрасінні", якую склалі графічныя аркушы і скульптура Н. Апіёк. У 1989 г. Вольгай Моракавай быў зняты фільм "Еўфрасіння Полацкая".

Каб глыбей спасцігнуць душу выдатнага чалавека, трэба абавязкова пабываць на яго радзіме. У велічным Сафійскім саборы, дзе Ефрасіння "нача книги писати своими руками", цяпер – канцэртная зала з арганам, а таксама музейная экспазіцыя, якая знаёміць з археалагічнымі знаходкамі, зробленымі ў час даследавання Полацка. Разам з саборам у ахоўную зону Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ўключаны архітэктурны комплекс Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, дзе захоўваецца рака з мошчамі прападобнай полацкай ігуменні. Напярэдадні святкавання 1000-годдзя прыняцця хрысціянства ў Полацку з'явілася вуліца Ефрасінні Полацкай, а ў 2000 г. у цэнтры горада быў адкрыты бронзавы помнік асветніцы, аўтарам якога стаў скульптар І. Голубеў – член Саюза мастакоў Беларусі. Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт адобрыў і падтрымаў гэты праект. У будаўніцтве помніка прынялі ўдзел усе палачане: ён быў узведзены на народныя сродкі. Манумент павернуты да галоўнай плошчы горада. Аўтар паказвае Ефрасінню як святую заступніцу Полацкай зямлі. Яна апранута па-манаску, у левай руцэ трымае пацеркі, а правай падымае шасціканцовы Крыж, быццам блаславіляе ім свой родны горад. Ёсць у багатым мінулым Бацькаўшчыны асобы, без якіх немагчыма ўявіць нашу гісторыю. Сярод іх пачэснае месца належыць Ефрасінні Полацкай. Яе жыццё з'яўляецца прыкладам для нашчадкаў. Ефрасіння Полацкая і ў наш час, "яко луча солнечная", асвятляе хрысціянскую падзвіжніцкую і асветніцкую дзейнасць у Беларусі.

## "Жыціе Ефрасінні Полацкай..." – старажытнабеларуская крыніца духоўнасці і мудрасці

*Пра жыццё і дзейнасць беларускай асветніцы можна даведацца з агіяграфічнага твора "Жыціе Ефрасінні Полацкай..." – унікальнага помніка літаратуры, гісторыі і культуры сярэдневяковай Беларусі. Напісаны ён невядомым аўтарам у канцы XII ст. Арыгінал твора, на жаль, не захаваўся. "Жыціе Ефрасінні Полац-*

*кай…” дайшло да нашага часу ў больш як 100 спісах XIV–XVIII стст. Змястоўная арыгінальнасць гэтага твора ў ідэі духоўнага ўдасканалення, ва ўслаўленні падзвіжніцтва, самаадданага служэння вышэйшым маральным ідэалам, у сцвярджэнні любві да кнігі, патрэбы ў ведах, асвеце.*

**Преподобная** Евфросиния, княжна и игумения Полотская : житие, чудеса, служба с акафистом. – Минск : Православное Братство в честь Святого Архистратига Михаила, 2006. – 111 с.

**Преподобная** Евфросиния игумения Полоцкая : житие и акафист. – Минск : Издательство Белорусского Экзархата, 2000. – 132, [44] с. : ил., фот.

**Житие** преподобной Евфросинии, игумении Полоцкой / [примеч. Г. Н. Шейкина]. – Минск : Православное Братство в честь Святого Архистратига Михаила, 2004. – 39 с.

**Аповесць** жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай / пер. Іван Саверчанка // Маладосць. 2006. № 12. С. 47–54.

**Аповесць** жыцця і прастаўлення святой і блажэннай і прападобнай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Прачыстай Яго Маці, што ў Полацку-градзе / [пер. І. Чароты] // Насустрач Духу : анталогія беларус. хрысціян. прозы / [уклад. і прадм. І. А. Чароты]. Мінск, 2002. С. 40–54.

Тое ж // Праваслаўе. 2001. № 10. С. 115–127.

*Аналіз “Жыція Ефрасінні Полацкай…”, а таксама біяграфічныя звесткі пра жыццё і дзейнасць святой прапануюцца ў матэрыялах:*

**Майхровіч, А. С.** Заходнеруская агіяграфія: Еўфрасіння Полацкая / А. С. Майхровіч // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / НАН Беларусі, Ін-т філасофіі. Мінск, 2008. Т. 1 : Эпоха Сярэднявечча / [В. Б. Евароўскі і інш. ; рэдкал.: В. Б. Евароўскі і інш.]. С. 309–341.

**Левшун, Л. В.** “Житие преподобной Евфросинии Полоцкой” как исторический источник: факты, образы, интерпретации / Левшун Л. В. // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. / ГУО “Респ. ин-т высш. шк.”, Каф. ист.-культ. наследия Беларуси ; [редкол.: А. В. Мартынюк (отв. ред.) и др.]. Минск, 2009. Вып. 2. С. 252–266.

**Левшун, Л. В.** Житие преп. Евфросиньи игуменьи Полоцкой / Л. В. Левшун // История восточнославянского книжного слова XI–XVII вв. / Л. В. Левшун. Минск, 2001. С. 157– 159.

**Саверчанка, І.** Жамчужына гатычнага пісьменства / Іван Саверчанка // Маладосць. 2006. № 12. С. 44–47.

*У традыцыі праваслаўя існуюць розныя формы шанавання святых: дні памяці, песнапенні, малітвы. У гонар прападобнай Ефрасінні Полацкай у 1893 г. была зацверджана спецыяльная царкоўная служба, а праз сем гадоў, у 1900 г., іераманах Нікадзім напісаў акафіст – хрысціянскае хвалебнае царкоўнае песнапенне. Дзень памяці святой адзначаецца 23 мая (5 чэрвеня па новым стылі).*

**Акафист** преподобной матери нашей Евфросинии, игумении и княжне Полотской : память преподобной Евфросинии Полоцкой совершается 23 мая/5 июня. – Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2010. – 31 с. : ил.

**Акафист** преподобной Евфросинии Полоцкой. – Минск : Православное Братство в честь Святого Архистратига Михаила, 2004. – 31 с.

**Густова, Л. А.** Образ святой преподобной Евфросинии Полоцкой – просветительницы Белой Руси в гимнографии XII–XX столетий / Л. А. Густова // З неапублікаванай спадчыны : манаграфіі, арт., вершы, матэрыялы навук. канф., успаміны сучаснікаў / Аляксей Мельнікаў ; [уклад.: Л. В. Ляўшун, Л. Ф. Анцух ; навук. рэд. і аўт. прадм. В. А. Чамярыцкі]. Мінск, 2005. С. 552–565.

## Каб памяць пра асветніцу жыла

*Аб жыцці і падзвіжніцтве Ефрасінні Полацкай напісаны навуковыя даследаванні, манаграфіі, навукова-папулярныя і мастацкія творы. Таксама неаднаразова перавыдавалася яе "Жыціе...". Са старонак твораў, прысвечаных асветніцы, паўстае вобраз неадназначнай асобы – адукаванай, рашучай, настойлівай і смелай.*

**Ефрасіння Полацкая** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1998. Т. 6. С. 405.

**Евфросиния Полоцкая** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. Минск, 2006. Т. 3. С. 487.

**Ефрасіння Полацкая** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1996. Т. 3. С. 358–359.

**Ефрасіння Полацкая** // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. Мінск, 1994. С. 200.

**Ефрасіння Полацкая** // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. 2-е выд. Мінск, 2006. С. 160–163.

**Ефрасіння Полацкая** // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. Мінск, 2001. С. 109.

**Ефрасіння Полацкая** (каля 1101 г. – 23 ці 25.5.1167 г.) // 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур = 250 people from Belarus in the dialogue of cultures / [рэд.: Т. Л. Пісарэнка, Л. У. Языковіч ; пер. на англ. мову Л. М. Серады]. Мінск, 2008. С. 7–9.

**Полоцкое** Радование: Свято-Евфросиниевские Торжества 1910 года / [концепция: монахиня Сергия (Бульчик), В. Ф. Сутягин, Г. Н. Шейкин ; тексты: монахиня Сергия (Бульчик) и др. ; худож. А. П. Маковцов]. – Полоцк : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке Полоцкой епархии Белорусской Православной Церкви, 2010. – 439 с. : ил., фот.

**Преподобная** Евфросиния Полоцкая / [сост. Н. Г. Куцаева]. – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2010. – 96 с. : ил., цв. ил.

**Евфросиния** Полоцкая / [авт.-сост. Н. Г. Куцаева]. – Минск : ФУАинформ, 2007. – 80 с. : цв. фот. – (Славное имя. Святые).

**Дивен** Бог во святых своих. Преподобная Евфросиния Полоцкая: житие, современные чудеса / Спасо-Евфросиниев. жен. монастырь в г. Полоцке Полоц. епархии Белорус. Православ. Церкви. – Полоцк : [Альтиора – Живые краски], 2010. – 71 с.

**Бирюкова, Л. М.** Слава тебе, святой свет преподобной Евфросинии Полоцкой! : пособие для педагогов и воспитателей общеобразоват. шк. / Л. М. Бирюкова. – Минск : Беларусь, 2003. – 111 с. : ил.

**Селицкий, А. А.** Евфросиния Полоцкая у истоков просвещения Полоцкого края ; Три единоличных изображения святых на северной стене келии Евфросинии Полоцкой / Селицкий А. А. // Наука – образованию, производству, экономике : материалы Пятой междунар. науч.-техн. конф. : в 2 т. / М-во образования Респ. Беларусь,

Белорус. нац. техн. ун-т ; [редкол.: Б. М. Хрусталев, Ф. А. Романюк, А. С. Калиниченко]. Минск, 2007. Т. 2. С. 46–56.

**Селицкий, А. А.** Евфросиния Полоцкая – солнечный луч, осветивший землю Полоцкую / А. А. Селицкий // Мастацкая адукацыя і культура. 2007. № 2. С. 59–61.

**Асветніцтва** і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 30–31 мая 2002 г., г. Наваполацк / Полац. дзярж. ун-т, Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Нац. Полац. гіст.-культ. музей-запаведнік ; [рэдкал.: У. І. Навіцкі (навук. рэд.) і інш.]. – Мінск : Дэполіс, 2002. – 145 с.

**Бяспалая, М. А.** Духоўная спадчына Ефрасінні Полацкай : (да 900-гадовага юбілею асветніцы / М. А. Бяспалая // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 23–26 мая 2002 г.) : матэрыялы чытанняў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры ; [рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) і інш.]. Мінск, 2003. С. 6–11.

**Яскевіч, А.** І паўднёваславянскі ўплыў. Полацкая, Турава-Пінская і Смаленская землі – як эпіцэнтры духоўнай асветы краю / Алена Яскевіч // Падзвіжнікі і іх святыні : духоўная культура старажыт. Беларусі / Алена Яскевіч. Мінск, 2001. С. 123–140.

Гл. на с. 123–128.

**Каліноўскі, І. І.** Культура Полацкай зямлі ў XII стагоддзі / І. І. Каліноўскі // Полацк і яго ваколіцы / І. І. Каліноўскі. Мінск, 2005. С. 31–39.

**Гальпяровіч, Н. Я.** Еўфрасіння Полацкая ; Лазар Богша / Н. Я. Гальпяровіч, Н. Г. Ваніна // Полацк – бацька гарадоў беларускіх / Н. Я. Гальпяровіч, Н. Г. Ваніна ; [рэдкал.: Н. Г. Ваніна і інш.]. Мінск, 2010. С. 26–31.

**Грыцкевіч, А.** Ефрасіння (Прадслава) Полацкая (1101–1167) / Анатоль Грыцкевіч // Славутыя імёны Бацькаўшчыны : зборнік / [уклад.: У. Гілеп і інш.]. Мінск, 2000. Вып. 1. С. 9–16.

**Кузняцоў, М. В.** Вялікая палачанка : (Еўфрасіння Полацкая) / М. В. Кузняцоў // Светлыя постаці гісторыі : (галерэя слаўных імён) / М. В. Кузняцоў. Мінск, 2007. С. 25–35.

**Марціновіч, А. А.** Як прамень сонечны : Ефрасіння Полацкая / Алесь Марціновіч // Зерне да зерня : гісторыя ў асобах / Алесь Марціновіч. Мінск, 2008. С. 54–64.

**Масляніцына, І.** Святая заступніца Белай Русі / І. Масляніцына // Жанчыны, найбольш знакамітыя ў гісторыі Беларусі / Ірына Масляніцына, Мікола Багадзяж. Мінск, 2008. С. 40–47.

**Мельнікаў, А. А.** Еўфрасіння Полацкая / Аляксей Мельнікаў. Еўфрасіння Полацкая і епіскап Ілля: гісторыя стасункаў і прычыны канфлікту / Гаранін С. Л. // З неапублікаванай спадчыны : манаграфіі, арт., вершы, матэрыялы навук. канф., успаміны сучаснікаў / Аляксей Мельнікаў ; [уклад.: Л. В. Ляўшун, Л. Ф. Анцух ; навук. рэд. і аўт. прадм. В. А. Чамярыцкі]. Мінск, 2005. С. 14–315, 499–508.

**Михаленко, Е. И.** Сказание о житии преподобной Евфросинии, игумении и княжны Полоцкой / Е. И. Михаленко. – [Минск : Свято-Елисаветинский женский монастырь в г. Минске, 2007]. – 74, [6] с. : цв. ил.

**Мяснікоў, А. Ф.** Еўфрасіння (1104–1167): асветніца з Полацка / Анатоль Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі : гіст. партр. / Анатоль Мяснікоў. 2-е выд., дапрац. Мінск, 2009. С. 13–16.

**Чаропка, В.** Найпадобнейшая князёўна : святая Еўфрасіння Полацкая / Вітаўт Чаропка // Лёсы ў гісторыі / Вітаўт Чаропка. Мінск, 2005. С. 5–9.

**Штыхаў, Г. В.** Найпадобная Ефрасіння Полацкая / Г. В. Штыхаў // Археолагі дапаўняюць летапісцаў / Г. В. Штыхаў. Мінск, 2009. С. 83–86.

**Авакян, Г. С.** Вялікая палачанка (Еўфрасіння Полацкая) / Г. С. Авакян, М. В. Кузняцоў, М. П. Сінькевіч // Палітычныя мысліцелі і гуманісты Беларусі / Г. С. Авакян, М. В. Кузняцоў, М. П. Сінькевіч ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. экан. ун-т. Мінск, 2002. С. 9–16.

**Перхавко, В. Б.** Евфросиния Полоцкая / В. Б. Перхавко // Князья и княгини Русской земли IX–XVI вв. / В. Б. Перхавко, Е. В. Пчелов, Ю. В. Сухарев. Москва, 2002. С. 187–197.

**Святая** преподобная благоверная княгиня Евфросиния Полоцкая // Подвижницы благочестия земли Русской. История женской русской святости X–XX веков / [ред.-сост. М. М. Петрова]. Москва, 2002. С. 27–37.

**Карпов, А. Ю.** Евфросиния Полоцкая / А. Ю. Карпов // Православные святые и чудотворцы / А. Карпов. Москва, 2005. С. 40–41.

**Глухов, А. Г.** “Они познали все книги” : Анна Ярославна и Евфросинья Полоцкая / Алексей Глухов // Ревнители просвещения России X–XVIII вв. : учеб. пособие для студентов вузов, получающих образование по направлениям (спец.) “Книжное дело”, “Издательское дело и редактирование”, “Книговедение”, “Библиотечно-информационные ресурсы”, “Культурология” / Алексей Глухов. Москва, 2007. С. 49–67.

**Ефрасіння Полацкая** (свецкае імя Прадслава, каля 1110 (?) – 23 або 25.5.1173) // Беларуская мова (прафесійная лексіка) : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў БНТУ : у 4 ч. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. нац. тэхн. ун-т, Каф. беларус. і рус. моў ; пад рэд. Л. А. Гіруцкай. Мінск, 2005. Ч. 1 : Беларуская мова: агульныя звесткі, паходжанне і развіццё, функцыянальныя стылі. С. 134–137.

**Петухова, Е. Л.** Еўфрасіння Полацкая (каля 1104–1167) / Е. Л. Петухова // Развіццё асветы і педагагічнай думкі на Беларусі: са старажытных часоў да XVIII ст. : вучэб. дапам. / Е. Л. Петухова ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Магілёўс. дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. Магілёў, 2004. С. 23–26.

**Шалькевіч, В. Ф.** Ефрасіння Полацкая / В. Ф. Шалькевіч, Дз. В. Мазарчук // Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / В. Ф. Шалькевіч, Дз. В. Мазарчук. Мінск, 2005. С. 19–21.

**Вішнеўская, І. У.** Грамадска-палітычныя погляды Еўфрасінні Полацкай / І. У. Вішнеўская // Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI стст.) : манаграфія / І. У. Вішнеўская. Мінск, 2008. С. 17–18.

**Козел, А. А.** Христианский гуманизм Евфросиньи Полоцкой, Климента Смолятича и Кирилла Туровского / А. А. Козел // Отечественная философия в контексте культурно-политической истории Беларуси : гуманист. аспект / А. А. Козел ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, Акад. МВД. 2-е изд., стер. Минск, 2008. С. 20–43.

**Цыганкоў, Л. М.** Прападобная Еўфрасіння як нацыянальны ідэал святасці / Цыганкоў Л. М. // Православие и школа на рубеже тысячелетий: опыт, проблемы, перспективы : сб. докл. VI Свято-Евфросиниев. пед. чтений (2–4 нояб. 1999 г., Минск) / [сост. С. А. Дейко ; науч. ред.: А. И. Кучинский (рук.) и др.]. Минск, 2000. С. 40–43.

**Аляксееў, А. А.** Прападобная Еўфрасіння Полацкая – нябесная апякунка Беларусі = Saint Euphrosyne of Polatsk – patron saint of Belarus / Аляксандр Аляксееў, Алег Лукашэвіч // Спадчына Беларусі [Выяўленчы матэрыял] = Heritage of Belarus : [фотаальбом] / Аляксандр Аляксееў, Алег Лукашэвіч. Мінск, 2007. С. 12–13.

**Гордун, С.** Преподобная Евфросиния Полоцкая – слава земли белорусской / С. Гордун // Адукацыя і выхаванне. 2010. № 6. С. 75–79.

**Святая** заступніца // Алеся. 2010. № 5. С. 18–20.

**Евфросиния** Полоцкая // Личность и культура. 2009. № 2. С. 58–59.

**Бирюкова, Л.** Святой Евфросинии свет над землей… / Людмила Бирюкова // Духовно-нравственное воспитание. 2008. № 6. С. 12–16.

**Дриняева, Л.** “Яко луча солнечная…” : о святой преподобной Евфросинии Полоцкой (память 23 мая/05 июня) / Людмила Дриняева // Директор. 2007. № 9. С. 94–95.

**Латышава, Н.** Асветніца і нябесная заступніца Беларусі / Н. Латышава // Пачатковая школа. 2007. № 3. С. 26–28.

**Козел, О. В.** Жизнь и деятельность преподобной Евфросинии Полоцкой / Козел О. В. // Мир медицины. 2005. № 6. С. 27–28.

**Голушко, В.** Лицо на фреске / Виктория Голушко // Horizons = Горизонты. 2004. № 2. С. 14–18.

**Васанская, Ж.** Нашы святыя / Жанна Васанская // Беларусь. 2004. № 4. С. 4–7.
Гл. с. 4–5.

**Спиридонова, М. П.** Судьба Евфросинии Полоцкой / Марина Спиридонова // Библиотека. 2002. № 10. С. 74–75.

**Ломсадзе, Л.** К Евфросинье на поклон / Лилия Ломсадзе // Беларуская думка. 2001. № 3. С. 85–93.

**Карпаленка, С. А.** Асоба і жыццё Еўфрасінні Полацкай / С. А. Карпаленка. Вывучэнне “Жыція Еўфрасінні Полацкай” / Г. М. Сляпухіна // Беларуская мова і літаратура. 2008. № 9. С. 38–44.

**Бахір, А. С.** Літаратурна-музычная кампазіцыя-віктарына “Спеў пра Еўфрасінню” / А. С. Бахір // Пазашкольнае выхаванне. 2002. № 3. С. 19–21.

**Материальное** воплощение духовного наследия Святой Евфросинии Полоцкой [Видеозапись] = Tangible spiritual heritage of St. Euphrosyne of Polotsk / [Нац. Полоц. ист.-культ. музей-заповедник ; фотографии А. А. Алексеева, О. В. Лукашевич]. – Минск : Залаты град, 2009. – 1 видеодиск (DVD), в футляре + брошюра (38 с.).

## Ад заняпаду да адраджэння

### Спаса-Праабражэнская царква, святыя мошчы<br>і Крыж Ефрасінні Полацкай

*Нястомна збіраючы вакол сябе таленты, Ефрасіння стала першай беларускай мецэнаткай: менавіта на гады яе асветніцкай дзейнасці прыпадае будаўніцтва Спаса-Праабражэнскай царквы, якая стала вяршыняй архітэктурнай школы Полацка, яркім увасабленнем духоўнай спадчыны палачан. Гэты сабор захаваўся да нашых дзён. Ён быў узведзены таленавітым дойлідам-манахам Іаанам паміж 1152–1159 гг. Сцены храма ўпрыгожваюць унікальныя фрэскі, якія ўражваюць неверагодным багаццем фарбаў, псіхалагічнай глыбінёй і эмацыянальнасцю. Полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр і яго галоўная царква на працягу стагоддзяў перажылі часы ўзвышэння і гады поўнага заняпаду – ім быў наканаваны гісторыяй нялёгкі лёс. З 1581 г. (з невялікім перапынкам у 1654–1667 гг., калі горад быў захоплены расійскім войскам) храм належаў ордэну езуітаў, якія ператварылі яго ў касцёл. Пасля выгнання езуітаў з Полацка царква перайшла да ордэна піяраў, а ў 1832 г. яе зноў*

*перадалі праваслаўным. Сёння старажытная цвярдыня слова Божага перажывае сваё новае адраджэнне, што пачалося ў 1989 г., і з'яўляецца каштоўным помнікам архітэктуры, які займае пачэснае месца ў скарбніцы беларускай культуры.*

**Сарабьянов, В. Д.** Спасо-Преображенская церковь Евфросиньева монастыря и ее фрески / В. Д. Сарабьянов. – Изд. 2-е. – Москва : Северный паломник, 2009. – 225, [2] с. : цв. фот.

**Штыхаў, Г. В.** Каменны летапіс / Г. В. Штыхаў // Археолагі дапаўняюць летапісцаў / Г. В. Штыхаў. Мінск, 2009. С. 93–99.

**Полацкі** Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр / [аўт. тэксту А. А. Ярашэвіч ; пер. на англ. мову В. С. Кірылюка ; пер. на бел. мову А. С. Шагун ; фота А. П. Дрыбаса]. – Мінск : Беларусь, 2006. – 63 с. : каляр. фат. – На беларус., рус. і англ. мовах.

**Штыхаў, Г. В.** Сучаснік найпадобнай Еўфрасінні – полацкі дойлід Іаан / Г. В. Штыхаў // Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 30–31 мая 2002 г., г. Наваполацк / [рэдкал.: У. І. Навіцкі (навук. рэд.) і інш. ]. Мінск, 2002. С. 30–35.

**Селицкий, А. А.** Евфросиния Полоцкая у истоков просвещения Полоцкого края : регистр со святыми мученицами и преподобными в келии-молельне Евфросинии в Спасо-Преображенской церкви в Полоцке (середина XII в.) / Селицкий А. А. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (24–25 кастр. 2007 г.) / [уклад. Т. А. Джумантаева]. Полацк, 2009. С. 177–187.

**Селицкий, А. А.** Сюжеты полоцких фресок в просветительской деятельности Евфросинии Полоцкой / А. А. Селицкий // Мастацкая адукацыя і культура. 2006. № 3. С. 41–44.

*Спаса-Праабражэнская царква стала для праваслаўных вернікаў не толькі святыняй, якая можа расказаць пра сапраўдную веру і духоўныя подзвігі прападобнай Ефрасінні, яна з'яўляецца яшчэ і захавальніцай мошчаў асветніцы. Сёння прыйсці ў храм можна ў любы дзень. Пакланіцца астанкам славутай палачанкі, паглядзець у праніклівыя вочы на фрэсцы, якую лічаць верагодным партрэтам асветніцы, падняцца ў келлю святой, дзе так узнёсла думаецца пра вечнасць хараства, чалавечае прызначэнне на зямлі. Незаўсёды гэта можна было зрабіць, бо мошчы Ефрасінні Полацкай доўгі час знаходзіліся па-за межамі радзімы. Яны вярнуліся ў родны Полацк больш чым праз сем стагоддзяў пад пераззвон усіх гарадскіх званоў. Спецыяльна да перавозу мошчаў была зроблена мастаком П. Зыкавым рака ў форме саркафага з кіпарысавага дрэва. Зверху яе абліцавалі серабром і золатам, упрыгожылі рознакаляровымі глазурамі. Такія звесткі захаваліся ў архіўных дакументах. На жаль, арыгінал ракі да нашага часу не дайшоў. У 2002 г. над новым саркафагам па заказе Беларускай праваслаўнай царквы пачаў працаваць мастак-эмальер М. Кузьміч. Праз пяць гадоў рака была завершана. Яна стала аўтарскім творам, які выявіў погляд чалавека нашага стагоддзя на падзеі далёкай мінуўшчыны.*

**Житие** преподобной матери нашей Евфросинии, игумении и княжны Полоцкой : к 100-летию перенесения мощей преподобной Евфросинии Полоцкой. – Полоцк : Полоцкое книжное издательство : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в городе Полоцке, 2009. – 40, [3] с. : ил.

**Свято-Евфросиниевские** торжества 1910 года : к 100-летию перенесения мощей преподобной Евфросинии Полоцкой из Киева в Полоцк. – Полоцк : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке Полоцкой епархии Белорусской Православной Церкви, 2010. – [14] с.

**Да 100-годдзя** перанясення мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай // Беларускі праваслаўны каляндар, 2010 : месяцаслоў, звод імёнаў святых, да 100-годдзя перанясення мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай, свяцiцель Георгій Каніскі, думкі, святыні Гродзенскай епархіі / [уклад.: Л. Я. Кулажанка, Т. А. Матрунчык ; гал. рэд. протаіерэй Г. Латушка]. Мінск, 2009. С. 115–121.

**Незабвенные** дни [Изоматериал] : фотолетопись Свято-Евфросиниевских торжеств 1910 г. : к 100-летию перенесения святых мощей преподобной Евфросинии из Киева в Полоцк, 1910–2010. – Полоцк : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке Полоцкой епархии Белорусской Православной Церкви, [2010]. – 64 с. : фот.

**Чистякова, Е. Е.** Долгий путь на родину : к 100-летию перенесения мощей преподобной Евфросинии из Киева в Полоцк / Е. Е. Чистякова // Пазашкольнае выхаванне. 2010. № 5. С. 10–12.

**Антановіч, К.** Вяртанне праз столькі стагоддзяў / Кастусь Антановіч // Культура. 2010. 5–11 чэрв. (№ 23). С. 14.

**Пашкоўская, Л.** Саркафаг для Еўфрасінні / Людміла Пашкоўская // Мастацтва. 2007. № 11. С. 10–11.

*Асобае месца ў Спаса-Праабражэнскай царкве займаў Крыж, які па заказе Ефрасінні быў створаны ў 1161 г. полацкім майстрам-ювелірам Лазарам Богшам. Крыж выконваў ролю каўчэга для захавання хрысціянскіх святынь. Яго шасцiканцовая форма сімвалізавала сусвет. Святыня была зроблена з кіпарысу, упрыгожана каштоўнымі камянямі, залатымі і сярэбранымі пласцінамі, жэмчугам, 20 лікамі святых, выкананымі ў тэхніцы перагародчатай эмалі. Гэтыя эмалі па тэхніцы выканання не ўступалі лепшым візантыйскім узорам. Сам жа Крыж лічыўся шэдэўрам сусветнага ўзроўню, з'яўляўся каштоўным помнікам пісьменства. На ім было пазначана імя аўтара, кошт рэліквіі, гістарычныя звесткі і закляцце супраць крадзяжу. Лазар Богша быццам наперад бачыў: шмат разоў Крыж вывозілі, вярталі, выкрадалі і замуроўвалі ў сценах Спаса-Праабражэнскага сабора… Перад Вялікай Айчыннай вайной ён знаходзіўся ў Магілёўскім музеі. Апошні раз святыня знікла летам 1941 г. і, найверагодней, трапіла ў расійскія музейныя сховішчы. Ужо ў нашы дні Крыж святой Ефрасінні на аснове малюнкаў, фотаздымкаў і апісанняў арыгінала ўзнавіў мастак-ювелір М. Кузьміч.*

**Бутэвіч, А. І.** Крыж – святыня / Анатоль Бутэвіч // На далонях вечнасці / Анатоль Бутэвіч, Уладзімір Ягоўдзік. Мінск, 2010. С. 7–10.

**Мароз, У. В.** Крыж Еўфрасінні Полацкай / Уладзімір Мароз // Беларускі храм : эсэ / Уладзімір Мароз. Мінск, 2003. С. 17–19.

**Петровский, Н. В.** Кто же похитил Крест Евфросинии? / Н. В. Петровский // По следам утраченных шедевров / Н. В. Петровский. Москва, 2007. С. 68–76.

**Линник, И.** Святой Крест / Ирина Линник // Horizons = Горизонты. 2004. № 2. С. 19–21.

**Ланеўская, Г.** Крыж Еўфрасінні / Галіна Ланеўская // Мастацтва. 2003. № 2. С. 49.

**Сверкунов, В.** Партийные архивы скрывают крест святой? / Владимир Сверкунов // Директор. 2001. № 7. С. 49–51.

**Страшынская, А.** Крыж – ахоўнік усяго сусвету / Ала Страшынская // Целитель. 2009. № 8. С. 48.

**Штыхаў, Г. В.** Майстар-ювелір Богша / Г. В. Штыхаў // Археолагі дапаўняюць летапісцаў / Г. В. Штыхаў. Мінск, 2009. С. 86–89.

**Ломсадзе, Л.** Все остается людям / Лилия Ломсадзе // Беларуская думка. 2007. № 2. С. 98–104.

О работе брестского художника Н. Кузьмича над восстановлением Креста Евфросинии Полоцкой.

## Свеціць святое імя праз вякі

Вобраз Ефрасінні Полацкай у мастацкай літаратуры

*Вобраз Ефрасінні Полацкай заўсёды прыцягваў увагу беларускіх пісьменнікаў. Жывое славянскае слова, над распаўсюджваннем якога так шчыравала наша зямлячка, прарасло яе імем у літаратурных творах. Праца з матэрыяламі пра Ефрасінню, наведванне яе радзімы выклікаюць глыбокае эмацыянальнае ўзрушэнне. Таму не дзіўна, што паэты і празаікі адгукнуліся на вяртанне святога імя сваімі творамі. Вершы, аповесці, апавяданні, раманы пра Ефрасінню Полацкую друкаваліся ў перыядычных выданнях, а таксама выходзілі асобнымі кнігамі. Сярод іх вылучаюцца раманы Т. Бондар "Спакуса", А. Асіпенкі "Святыя грэшнікі", В. Коўтун "Пакліканыя", вершы Д. Бічэль-Загнетавай, Н. Тулупавай, А. Звонака, Р. Барадуліна і іншых пісьменнікаў. Празаічныя творы даюць разнастайны, багаты матэрыял пра жыццё і дзейнасць Ефрасінні і яе сучаснікаў, знаёмяць з гісторыяй Полаччыны. З паэтычных старонак паўстае вобраз асветніцы, падзвіжніцы, духоўнай апякункі Беларусі, непакорнай дачкі і мужнай жанчыны з нялёгкім, але незвычайным лёсам. З выданнямі апошніх гадоў чытачоў пазнаёміць наступны спіс:*

**Воюш, І.** "Я – вясна непаўторная!.." : вобраз Еўфрасінні Полацкай у беларускай літаратуры / Інга Воюш // Роднае слова. 2001. № 1. С. 32–35.

**Гальго, Н.** Вобраз Ефрасінні Полацкай у беларускай прозе / Наталля Гальго // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры Белдзяржуніверсітэта / [рэдкал.: І. Запрудскі, С. Кавалёў, Л. Тарасюк ; пад агул. рэд. М. Хаўстовіча]. Мінск, 2002. Вып. 3. С. 106–110.

**Лысова, Н. Б.** Аб адной тэндэнцыі беларускай літаратуры : (на прыкладзе вобразнага ўвасаблення Ефрасінні Полацкай у сучас. паэзіі / Н. Б. Лысова // IX Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 23–26 мая 2003 г.) : матэрыялы чытанняў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры ; [рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) і інш.]. Мінск, 2004. С. 129–133.

**Лысова, Н. Б.** Вобраз Ефрасінні ў сучаснай паэзіі. Спроба культуралагічнага аналізу / Н. Б. Лысова // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. Философия. Культурология. Литературоведение. Лингвистика. 2002. Т. 1. № 4. С. 21–25.

**Коўтун, В.** Пакліканыя : раман-жыціе / Валянціна Коўтун. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 245, [2] с. : іл.

**Дудараў, А.** Крыж : дыялогі вякоў у сямі частках з эпілогам / Аляксей Дудараў // Полымя. 2000. № 6. С. 48–73.

**Масленицына, И. А.** О том, что иногда монашеский клобук бывает предпочтительнее брачного венца : [новелла] / И. А. Масленицына // Летописцы повествуют о любви / И. А. Масленицына. Минск, 2002. С. 142–150.

**Левшун, Л.** Яко луча солнечная : (худож.-док. повествование) / Любовь Левшун // Врата небесные. 2010. № 5. С. 13–18 ; № 6. С. 11–15 ; № 7. С. 10–14.

**[Пахвала** Еўфрасінні Полацкай] / св. Кірыла Тураўскі. Пролог к преподобной матери Ефросинии / Сімяон Полацкі. Цень Ефрасінні / Алесь Звонак. Ефрасіння Полацкая / Алег Лойка. У Полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царкве / Рыгор Барадулін. Святая / Анэля Тулупава. Святая Еўфрасіння / Ніна Загорская. Погляд Святой Еўфрасінні / Станіслаў Валодзька. Ефрасіння : (балада аб жаночай волі) / Людміла Рублеўская. Багіня полацкіх званоў / Алена Мігаль // Насустрач Духу : анталогія беларус. хрысціян. паэзіі / [уклад. і прадм. І. А. Чароты]. Мінск, 2001. С. 60–61, 67–68, 87–88, 118–119, 125–126, 149–150, 167–168, 202, 210–211, 218–219.

**“Пакланюся** з табой Ефрасінні святой…” : [вершы] / Сімяон Полацкі [і інш.] // Роднае слова. 2001. № 1. С. 68–70.

**Зарицкий, Н.** Ефросинии Полоцкой : [стихотворение] / Николай Зарицкий // Нёман. 2008. № 2. С. 76–77.

**Лукша, В.** Крест Евфросиньи Полоцкой : [стихотворение] / Валентин Лукша ; пер. с белорус. Эдуарда Скобелева // Нёман. 2002. № 11/12. С. 3–4.

**Михаленко, Е.** Евфросинье Полоцкой : [стихотворение] / Елена Михаленко // Нёман. 2007. № 12. С. 101.

**Нафрановіч, А.** Ефрасіння Полацкая : [верш] / Аркадзь Нафрановіч // Роднае слова. 2004. № 2. С. 110.

*Дзецям пра Ефрасінню Полацкую*

**Тарасаў, С. В.** Ефрасіння Полацкая / Сяргей Тарасаў // Фрэскі : абразкі і апавяданні : [для сярэд. шк. узросту] / Сяргей Тарасаў. Мінск, 2004. С. 28–31.

**Палачанін, Ф. А.** Прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая / Ф. А. Палачанін // Школьнікам аб праваслаўнай веры / Ф. А. Палачанін. Мінск, 2006. С. 36–38.

**Марціновіч, А. А.** Святая Еўфрасіння, альбо Адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля : [для мал. і сярэд. шк. узросту] / Алесь Марціновіч. – Мінск : Беларусь, 2009. – 111 с. : іл., рэпрад.

**Марціновіч, А. А.** Як прамень сонечны: Ефрасіння Полацкая / Алесь Марціновіч // Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі : [для мал. і сярэд. шк. узросту / склад. І. Б. Клепікаў]. Мінск, 2010. С. 105–118.

**Марціновіч, А. А.** Святая Еўфрасіння : нарыс : [для мал. шк. узросту] / Алесь Марціновіч ; [маст. В. П. Сташчанюк]. – 2-е выд. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 62 с. : каляр. іл.

**Преподобная** Евфросиния Полоцкая / [пересказала для детей С. П. Демченко]. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2010. – 17 с. : цв. ил.

*Складальнікі: Г. В. Брага*
*Т. І. Лагош*
*Рэдактар К. Д. Варанько*